Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (537) Субота, 5 кастрычніка 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

# Чарговы і зноў цікавы...

Кожны раз, як толькі рэдкалегія насценгазеты «Даследнік» — органа студэнцкага навуковага таварыства геаграфічнага факультэта—выпусціць свой чарговы нумар, у перапынкі і пасля лекцыйных і семінарскіх заняткаў ля прыгожага стэнда збіраюцца купкі студэнтаў. Дзэнь, другі, трэці... Да таго часу, пакуль усе студэнты і супрацоўнікі факультэта не пазнаёмяцца з яе цікавым зместам і прывабным знешнім выглядам і афармленнем.

Не маглі ўтрымацца і мы, каб не падыйсці да газеты, не палюбавацца яе ілюстрацыямі. А калі падыйшлі, то ўжо не адарваліся да таго часу, пакуль не прачыталі ўсе заметкі, пакуль не прагледзелі ўсе ілюстрацыі.

А чытаць у газеце ёсць што. Памяркуйце самі: у нумары 9 заметак, 10 ілюстрацый. Іх змест разнастайны. Дастаткова назваць хоць некалькі загалоўкаў («Лета не прайшло дарэмна», «Горад на Прыпяці», «Сонцу і ветру насустрач», «Выдатны куток беларускай прыроды»), каб стала зразумела, з якім густам і творчым агеньчыкам рэдакцыйная калегія робіць сваю насценную газету, з якой адказнасцю адносіцца да выканання камсамольскага даручэння.

Даведаўшыся, што мы з рэдакцыі шматтыражкі, да нас падыходзіць рэдактар насценгазеты Іна Гацко. Пытаемся:

— Скажыце, Іна, які матэрыял Вы лічыце за лепшы?

— Усе матэрыялы мы рабілі з душой. Члены нашай рэдкалегіі Нона Рудакова, Анна Карлюк. Марыя Жынгель і Яўген Самуйловіч, як бачыце, не шкадуюць старання і часу, каб газета была цікавай. Што датычыцца лепшых матэрыялаў, то не ведаю, як другія члены рэдкалегіі лічаць, а на маю думку, лепшыя матэрыялы гэта — «Аб людзях харошых» і «Выдатны куток беларускай прыроды».

Яшчэ раз перачытваем заметкі. Сапраўды, у заметцы «Выдатны куток беларускай прыроды», напісанай студэнтам А. Таран, многа цікавага, падрабязна расказана, як 9 студэнтаў на чале з дацэнтам Ольгай Філіпаўнай Якушка за летнія месяцы даследавалі 15 азёр агульнай плошчай 4—5 квадратных кіламетраў. Многім азёрам студэнты ўпершыню далі падрабязную геаграфічную і марфаметрычную характарыстыку. Вельмі добра, што гэтая заметка суправаджаецца старанна выкананымі ілюстрацыямі, картай — схемай азёр Ушацкай групы.

Заметка «Аб людзях харошых» куды меншая і змешчана яна ў ніжнім правым кутку газеты. За мноствам матэрыялаў, фатаграфій на яе спачатку можна і не звярнуць увагі, а калі прачытаеш, то ў сэрцы ўзнікае глыбокі гонар за нашу рэчаіснасць, радасць за нашых добрых савецкіх людзей. А расказваецца ў заметцы аб тым, як у час навуковых экспедыцый студэнты сустракаліся з людзьмі розных прафесій: з шафёрамі, экскурсаводамі, праваднікамі і інш. Аб гэтых людзях сказана толькі па некалькі слоў, але тым не менш сказана вельмі многа. Кожны з іх на сваім пасту дапамагаў маладым даследнікам мацней палюбіць багатую савецкую зямлю, пранікнуцца павагай да простых савецкіх людзей.

— Можа, заўвагі якія будуць?

— Што Вы, — адказваем мы. Якія заўвагі? Вельмі добра. А вось пажаданні будуць. Пажаданні і надалей рабіць такую цікавую газету.

Побач з газетай «Даследнік» вывешан свежы нумар газеты «Географ» — агульнафакультэцкай газеты. «Географ» куды горшы за «Даследніка» — горш аформлены, заметкі размешчаны абы як, няма ілюстрацый.

— Трэба, відаць, наладзіць крытыку факультэцкай газеты,— выказваем мы думку.—Параўнаць з Вашай.

Студэнты не згаджаюцца з гэтым. «Географ» жа толькі ўпершыню выйшаў такім непрыглядным. Рэдактар Леанід Анісаў заняты, на практыцы знаходзіцца. Вось і выпусцілі такую газету. Спяшаліся.

Што ж, улічым голас студэнтаў. Але няхай улічыць і члены рэдкалегіі «Географ», што насценную газету трэба рабіць лепш.

А. БАРАНАЎ.

## Мой адказ Кусавай

Прачытаўшы пісьмо С. Кусавай у рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт», якое было надрукавана ў 26-м нумары, я вельмі здзівіўся. Так, нашы факультэты сапраўды не раздзяляюць пустыні і акіяны, і нішто не перагароджвае шлях нашым імкненням і вучобе, ніхто не перашкаджае студэнцкай дружбе. І няўжо студэнтам патрэбны нянькі, у ролю якіх С. Кусава хоча паставіць камітэты камсамола? У нас жа часта праводзяцца вечары сустрэч і на факультэтах, і ў цэлым па універсітэту, праводзяцца яны і ў гуманітарным корпусе, дзе вучыцца С. Кусава. Студэнты розных факультэтаў універсітэта займаюцца ў адных гуртках і спартыўных секцыях. Усё гэта збліжае студэнтаў, садзейнічае нашай дружбе, дружбе паміж факультэтамі.

Мне здаецца, дарэмна С. Кусава скардзіцца на адарванасць факультэцкіх калектываў адзін ад аднаго. У нас жа гэтага няма!

Барыс ФАМІН,
студэнт 2 курса геафака.

## Студэнты—цаліне

### Сустрэча ў ЦК ВЛКСМ

Дзевятнаццаць тысяч студэнтаў працавалі мінулым летам у раёнах цалінных зямель. На сустрэчы, якая адбылася днямі ў ЦК ВЛКСМ, важакі маладзёжных атрадаў расказалі аб тым, як выдатная ініцыятыва, што зарадзілася пяць гадоў назад, вырасла ў велізарны патрыятычны рух студэнцтва, дэвізам якога стала — жыць і працаваць па-камуністычнаму.

Вось шчодрыя вынікі летняй студэнцкай пары. 845 жылых дамоў, у тым ліку 15 новых вуліц. Шэсць тысяч школьнікаў селі за парты ў новых школах, а паўтары тысячы дзяцей атрымалі ў падарунак ад студэнтаў дзіцячыя сады і яслі. Доказам таго, што студэнты могуць будаваць і будаваць добра, служаць гарантыйныя пашпарты, выдадзеныя на 1.800 жыллёвых і культурных аб'ектаў толькі ў Цалінным краі.

Выступіўшыя на сустрэчы называлі не толькі выдатныя лічбы, але прыводзілі яркія факты таго, як цаліна ў сваю чаргу выхоўвала людзей, як яе шырокія стэпавыя аўдыторыі для многіх хлопцаў і дзяўчат, ператварыліся ў школу жыцця, як навучыла яна пачуццю локця і таварыскасці.

Студэнты 20 гарадоў Расійскай Федэрацыі, Украіны, Беларусі, Казахстана, Грузіі, Азербайджана жылі адзінай сям'ёй і мэта была ў іх агульная — зрабіць больш і лепш для цаліны. Тут біла крыніцай і шэфская работа. Студэнты правялі паўтары тысячы лекцый, 800 канцэртаў, 1.400 спартыўных святаў.

На сустрэчы было сказана многа добрых слоў і ў адрас студэнтаў і аспірантаў медыцынскіх вну, якія ўзялі на сябе ахову здароўя цалiннікаў.

— Работы, якія выкананы гэтым летам на цаліне,—сказала сакратар ЦК ВЛКСМ М. Жураўлёва,— яшчэ раз пацвердзілі, што наша студэнцтва здольна самастойна ажыццяўляць вялікія і адказныя справы. Такія выдатныя якасці, як калектывізм, дружба, воля і энтузіязм, выкаваныя ў працы, знаходзяць сваё прадаўжэнне і ў вучобе.

## Універсітэт за тыдзень

У Савецкім Саюзе, па запрашэнню ЦК ВЛКСМ, знаходзіцца дэлегацыя Цэнтральнага Камітэта Працоўнай Моладзі Румыніі на чале з сакратаром ЦК СПМ таварышам Ністарам Актавіянам. У саставе дэлегацыі таксама намеснік загадчыка аддзела аграработы СПМ Думітру Георге, першы сакратар Плаешцкага абкома СПМ Кырстое Тома, сакратар Яскага абкома СПМ па школах і піянерскай рабоце Чобану Мар'ю, першы сакратар РК СПМ Каларашцкага раёна Бухарэсцкай вобласці Чкім Васіле. Дэлегацыя знаходзілася ў Беларусі чатыры дні. За гэты час госці наведалі прамысловыя прадпрыемствы горада Мінска, пабывалі ў школах і калгасах рэспублікі, знаёміліся з вопытам работы камсамольскіх арганізацый. 2 кастрычніка ў камітэце камсамола БДУ адбылася сустрэча румынскай дэлегацыі з членамі камітэта камсамола універсітэта.

1 кастрычніка пачаліся прыёмныя экзамены на завочнае аддзяленне юрыдычнага факультэта, на аддзяленні філасофіі і журналістыкі (асенні паток).

Група студэнтаў аддзялення журналістыкі приступіла да выпуску чарговага нумара сваёй вучэбнай газеты «Журналіст». Нумар прысвячаецца працаўнікам сельскай гаспадаркі Мінскага раёна.

Днямі на матэматычным факультэце адбылося адкрыццё школы юных матэматыкаў горада.

Першакурсніку

# Як слухаць, як канспектаваць лекцыю

Ты стаў студэнтам. Тваё новае студэнцкае жыццё пачалося з першай лекцыяй, якую ты праслухаў ва універсітэцкай аўдыторыі. Лекцыя — галоўная форма выкладання ў ВНУ. Яна ўводзіць студэнта ў навуку, знаёміць з асноўнымі тэарэтычнымі палажэннямі дысцыпліны, знаёміць з новымі дасягненнямі ў навуцы. Яна мае пазнавальнае і асветніцкае значэнне. Каб лекцыя дайшла да розуму і душы, каб пакінула глыбокі след, трэба ўмела канспектаваць, працаваць над канспектам пасля лекцыі.

Як слухаць лекцыю?

Па-першае, гэты працэс не механічны, а творчы і псіхалагічны. Ён патрабуе ад студэнта асаблівай увагі. Неабходна прымусіць сябе думаць толькі аб тым, што гаворыць выкладчык і забыцца аб усім іншым.

Але толькі ўважліва слухаць — мала. Абавязкова патрэбна рабіць кароткія запісы, канспектаваць лекцыю. Бо калі студэнт толькі слухае лекцыю і не запісвае, ён можа не звярнуць увагі на галоўнае і потым цяжэй будзе яму разабрацца ў матэрыяле. Для таго, каб глыбока разабрацца ў матэрыяле, неабходна мабілізаваць слых, зрок, памяць, работу рукі, мышленне. Запісы ў час лекцыі развіваюць памяць — гэта вельмі важна; а таксама актывізуецца ўспрыйманне. Трэба сказаць, што канспектаванне апраўдвае сябе толькі тады, калі запісы вядуцца ўмела. Няправільна робіць студэнт, калі ён запісвае слова ў слова за выкладчыкам: яму няма часу ўдумацца ў сэнс, ён не паспявае, і тады выкладчыку даводзіцца гаварыць марудней, а лекцыя ператвараецца ў дыктант. Такая тэндэнцыя шкодная. Пры такім метадзе працы студэнт становіцца пратакалістам — стэнографам, бо запісы перашкаджаюць разумець матэрыял. Неабходна запісваць толькі галоўнае.

Хочацца сказаць і аб тым, што паўнацэннае разуменне лекцыі залежыць ад таго, як яна чытаецца. Калі лекцыю чытаць без належнага аналізу фактаў, без наглядных дапаможнікаў, калі выкладчык толькі пераказвае тэкст кнігі і не стараецца наладзіць кантакт з аўдыторыяй, то пры любых адносінах студэнтаў да лекцыі, пры старанным канспектаванні яе, яна не пакіне сур'ёзнага следа ў слухачоў, канспект лекцыі будзе копіяй дрэннага арыгінала.

Форма запісу можа быць рознай. Напрыклад, па фізіка-матэматычных і хімічных дысцыплінах студэнты запісваюць у канспект усё тое, што выкладчык запісвае на дошцы і тлумачыць запісанае. Па біялагічных навуках больш робіць замалёвак з кароткімі тлумачэннямі. Па гуманітарных дысцыплінах і асабліва па гісторыі, каб пранікнуць у сэнс запісу слоў лектара, найлепш весці запісы па наступнай схеме:

1. Галоўныя матэрыялы, выкарыстаныя для напісання лекцыі.
2. Важнейшая аргументацыя, галоўныя факты.
3. Адзнака тых пытанняў, якія патрабуюць тлумачэння выкладчыка.

Умела канспектаваць лекцыю — адзін бок справы. Над канспектамі лекцый трэба сур'ёзна і сістэматычна працаваць. Неабходна ў той дзень, калі праводзіцца лекцыя, на свежую памяць прагледзець і перачытаць канспект, выправіць дапушчаныя ў ім памылкі. Канспекты патрэбна праглядзець і тады, калі закончыш распрацоўку тэмы па навуковай літаратуры, параўноўваеш запісы ў канспекце і ў падручніку. Усё, што будзе незразумела, трэба абавязкова выначаць у час кансультацыі. Ніколі не пакідайце незразумелых пытанняў.

Добра напісаны канспект лекцыі будзе вялікай дапамогай ў час падрыхтоўкі да экзаменаў.

І. ДАНЕЦ.

# Літаратурная старонка

## Маё каханне

### ГУМАРЫСТЫЧНАЕ АПАВЯДАННЕ

Мої нябожчык дзед, царства яму нябеснае, гаварыў мне некалі: не радзіся багатым, радзіся шчаслівым. «Чалавечае жыццё,— дадаваў ён, — перш за ўсё залежыць ад лёсу, а не ад яго асабіста. І той дурань, хто імкнецца сам зрабіць свой лёс лепшым, чым ён ёсць. Гэта ўсё роўна, што лбом дзверы адчыняць. Зламаў чалавек нагу, жывот забалеў, жывеш бедна, утапіўся, памёр без пары — значыць, лёс яго такі. Калі дала табе матка-прырода добры лёс, ты ўсё сваё жыццё будзеш жыць во як! — Пры гэтым дзед праводзіў пальцамі па сваёй шыі, што азначала вышэйшую ступень шчасця. — Вось скажу пра сябе...».

І ён мне расказаў доўгую трагікамічную гісторыю свайго «шчаслівага» жыцця, як ён пасвіў каровы ў аднаго пана і яго менш за іншых лупцавалі, як яму шанцавала ў канакрадстве, як яму ў дзевятнаццаць год удалося «закруціць каханне» з панскай дачкой, за што дзеда пан выгнаў з маёнтку і зламаў дзве рабрыны... І шмат чаго іншага расказваў дзед.

Я слухаў і, прызнацца, нічога не разумеў са сказанага. Можа таму, што быў я тады зялёным падшыванцам, мо' таму, што дзед так і не сказаў мне толкам, дзе і ў чым шчасце, а можа і таму, што я лічыў сябе занадта адукаваным, бо прайшоў ужо класы з чатыры, — я недарэчна смяяўся над дзедавай верай у лёс, шчасце, кпіў з яго, за што не раз атрымліваў добрыя аплявухі, ад якіх заўсёды хацелася плакаць, але я не плакаў, стараючыся захаваць свой адлупцаваны, як належыць, прэстыж.

Толькі цяпер, калі дзеда даўно ўжо няма ў жывых, а я з зялёнага падшыванца ператварыўся ў зграбнага юнака (аб чым я асабіста чуў ад дзяўчат) і няўдала пакахаў, я з удзячнасцю ўспамінаю дзедавы словы наконт шчасця, лёсу, добра ведаю ім цану. Эх, дзядуля, дзядуля... які я няшчасны ў свае дваццаць юнацкіх гадоў! І, пэўна, таму, што пайшоў вайною супраць свайго лёсу. Замест таго, каб заняць вычакальную пазіцыю, чакаць, пакуль шчасце само прыдзе ў рукі, я, закахаўшыся, пачаў сам бегаць за ім, лавіць, як дзеці ловяць матылькоў.

А шчасце маё — гэта дзяўчына, прыгожая, вочы нібы васількі, а валасы — сапраўднае золата! І вельмі ж ужо разумная — казалі, пятнаццаць гадоў вучылася на настаўніцу. Пакахаў яе даўно, калі яна толькі прыехала ў нашу школу. Тры месяцы збіраўся прызнацца — вядома, просты вясковы хлопец!

І вось аднойчы, даведаўшыся, што яна ў нашым клубе чытае лекцыю, я ўсё ж рашыўся. Зайшоў ёй наперад, стаў на сцяжынку, як разбойнік, і чакаю. Прачакаў бітых тры гадзіны. А сцюжа на дварэ была — свету боскага не бачна, мароз — пэўна, градусаў трыццаць. Апрануты ж я быў так лёгка, што амаль не здубеў на холадзе. Праўда, усё абыйшлося добра, калі не лічыць, што змарозіў вуха (але ж нічога, каханне патрабуе ахвяр):

Хутка я яе дачакаўся. Прывітаўся. Яна, бачна, была здзіўлена такой сустрэчай.

— Я Вас чакаў, — кажу я ёй.— Прабачце мяне...

Хацеў яшчэ нешта сказаць, усё тое, што я адчуваў, ідучы на гэтае спатканне, але мой пракляты язык бы прымёрз. Стаю. Маўчу. А яна пазірае на мяне ды смяецца (ёй, бачна, прыемна бачыць маю разгубленасць).

— Даруйце, я не магу, лепш заўтра апішу Вам, — нарэшце, выгукнуў я і, не развітаўшыся, пабег дамоў.

Усю ноч я не заснуў, праклінаючы сваю разгубленасць, сарамлівасць. Назаўтра раніцай я сеў пісаць да яе ліст. Пачаў я яго так:

«Божа мой! Я не ведаю, што са мной, што я раблю. Я ўсю ноч не спаў, хоць і спрабаваў заснуць, забыць Вас, выкінуць думку з галавы аб Вас, як аб недасягаемым для мяне шчасці. Але Ваш любы вобраз, распалены бяссонніцай, не даваў мне спакою. Перад маімі вачыма з'яўляліся Вы, любая, каханая ўсім маім юнацкім сэрцам, пяшчотная, сатканая з залатых нітак мар, сплеценая з лёгкіх карункаў летуценнаў, прыгожая, быццам міфічная Вакханка з далёкіх берагоў Грэцыі, лагодная, ззяючая, нібы жамчужына, духмяная, як рамонка...».

Пісаў амаль увесь дзень. Напэўна, з сотню эпітэтаў і столькі ж параўнанняў падарыў я ёй у гэтым лісце, уклаўшы ў яго ўвесь запас прачытанага. Ды ў дадатак склаў ёй такі верш (бо, вядома, каханне робіць кожнага з нас паэтам), што, пэўна, мне пазайздросціў бы нават Рыгор Барадулін. І прыпісаў: «Буду чакаць у дзевяць гадзін вечара на вызначаным месцы». Пісьмо гэта пад вечар, калі мой прадмет кахання быў яшчэ ў школе, я аднёс ёй на дом, перадаўшы яго нейкай цётцы, мусіць, гаспадыні хаты, бо яна, калі я зрабіў адзіны крок на вымытую падлогу, прыкрыкнула на мяне: «Шляецеся тут!».

З думкай «Прыдзе ці не?» яшчэ за гадзіну да спаткання я быў ужо там. Вечар быў цудоўны. Неба было такое чыстае, нібы наша падлога перад святам. У яго вышыні плыў малады, сарамлівы, як я, акружаны прыгажунямі-зорачкамі, месяц. У цішыні снег так хрусцеў пад нагамі, што калі, прачакаўшы цэлую гадзіну, я пачаў тупаць ад холаду нагамі, сабакі паднялі страшэнны гвалт, хоць уцякай.

Вось і дзевяць гадзін. Яе няма. Трывожуся. Раз-по-разу пазіраю то на гадзіннік, то на яе акно. Праходзіць яшчэ гадзіна, другая. здаецца, цэлая вечнасць. Вось гасне агонь. Скрыпнулі дзверы. І зноў цішыня, недарэчная, прыкрая.

Іду, нібы п'яны, дадому. Усю ноч пакутую. Зморaны, бледны, з чырвонымі вачыма сустракаю раніцу. У грудзях цяжка, горка, нешта ные, у галаве — кашмар.

Сёння нядзеля. Да вечара пакутую, а ўвечары іду ў клуб. На танцы.

А там грукаюць абцасамі, пырскаюць смехам і весялосцю. Мой прадмет кахання ўжо тут. Круціцца па крузе з гэтым цыбатым заатэхнікам. Ды так «стыльна». Калі ён, пратанцаваўшы з ёй факстрот, адыходзіць ад яе, я хуценька запрашаю яе на вальс. Танцую па-свойму, па-вясковаму, як заправскі кавалер. Яна маўчыць. Крыху моршчыцца ад маіх «танцаў». Пратанцаваўшы, адвожу яе на месца. Прашу прабачэння і саджуся побач. Некаторы час маўчу, а потым пачынаю дрыжачым ад хвалявання голасам: «Чаму Вы не адказалі на маё пісьмо? Чаму Вы не прыйшлі на спатканне? Не мучайце, скажыце...».

— Дзівак ты! Няўжо ты думаеш, што я змагу пакахаць цябе, простага хлопца? Звязаць свой лёс з табой, толькі таму, што ты прыгожы? О не... ты памыляўся! Што ў нас можа быць агульнага?... Мы ж і не зразумеем адзін аднаго. Я, напрыклад, люблю горад, музыку, мастацтва, вялікае, культурнае жыццё. Ну, а ты зможаш даць мне гэта? Цемра! Цьфу... І наогул, нам больш няма аб чым гаварыць. Паставім кропку!

— А можа шматкроп'е?! — заікнуўся было я. Але яна і ўвагі не звярнула на мае словы.

Што мне было рабіць? Падняўся, пачухаў патыліцу і паплёўся сабе дамоў.

Прыйшоў — і адразу ўзяўся за кніжкі. Закончыў сярэднюю школу. Паступіў ва універсітэт. Як бачыце, каханне мне тут дапамагло.

А днямі атрымаў ліст ад яе. Піша, што рада за мяне, што хоча сустрэцца са мной.

Толькі я не ведаю, што ёй адказаць.

**Уладзімір МАНГІНОВІЧ,**
**студэнт 2 курса аддз. журналістыкі.**

## Звёздный вечер

Шагая, вечер гроздья звёзд
В озёра набросал.
Зайдя случайно на завод,
К трубе их привязал.
Луну повесил грушей вниз,
Как на столбе фонарь.
Хоть на носках приподнимись
И палкою ударь.
Эх, звёзды! Сколько им гореть
Без дела за окном!
Я не могу вот так смотреть
На этот звёздный лом.
Лопатой взять бы звёзды все
Сгрузить на самосвал
И подвезти их по росе
К заводу на металл.
Я с теми, кто в жару, в мороз,
Своим земным трудом
Пришёл зажечь побольше звёзд
На своде на земном.
Звёзд ярче светят фонари,
Как будто здесь, в цехах,
Их выточили из зари
Ребята на станках.

**Александр ПОПЕЛЬ,**
**художник Белорусского автозавода.**



Веды — сіла.

Фотаэцюд Э. Талачынскага.

## Трубач

Пясок і пыл на тварах грымам.
Мы ўсе ў маечках і кедах.
І, сустракаючы нас, грымнула
Труба са школьнага аркестра.
Трубач маленькі хваляваўся
Перад намі, перад госцямі.
Ён так стараўся, так стараўся,
Што ўсе яму зайздросцілі.
О, як яго мы разумелі!
Сюды, у стэпы, сёлета
Мы школу ўзводзіць прыляцелі —
Яму вучыцца ў школе той.
Пасля трубач пабудку граў нам
(Ён быў малы, а кемлівы)
І мы грузілі шорсткі гравій,
Раствор кідалі кельмамі.
Мы «выбівалі» лес і цэмент.
Мы бралі сілай, вераю.
Ужо былі гатовы сцены —
Назад паклікаў верасень.
Сябры нас цiскалі ў абдымках.
Мы чуем толькі добрае.
А прад вачмі стаяць будынкі,
Што там не дабудаваны.
А ў вушах шапоча гравій.
А ночамі вялікімі
Малы трубач пабудку грае —
На дапамогу клікае...

**А. СЕРБАНТОВІЧ**

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА ШТОМЕСЯЧНЫ ЧАСОПІС «РАБОЧЕ-КРЕСТЬЯНСКИЙ КОРРЕСПОНДЕНТ»

Часопіс выдаецца рэдакцыяй газеты «Правда» як практычны дапаможнік для рабочых і сельскіх карэспандэнтаў, рэдактараў і членаў рэдкалегій насценных і шматтыражных газет, для грамадскага актыву друку. У часопісе абагульняецца вопыт рабселькораўскага руху, асвятляюцца яго задачы, друкуюцца агляды нізавога друку, кансультацыі рэдкалегіям насценгазет, работнікам шматтыражных газет. даюцца адказы на пытанні актывістаў друку.

Часопіс паказвае развіццё грамадскіх пачаткаў у журналістыцы, практыку правядзення рабселькораўскіх рэйдаў, вопыт рабселькораўскіх пастоў, работ школ рабселькораў.

Чытач знойдзе ў часопісе парады па літаратурнай справе: як і аб чым пісаць у газету, як збіраць і апрацоўваць матэрыял. У часопісе асвятляецца дзейнасць літаратурных аб'яднанняў, публікуюцца нарысы, фельетоны, вершы.

Са старонак часопіса з рабселькорамі размаўляюць партыйныя, дзяржаўныя і прафсаюзныя дзеячы. Ва ўспамінах старых камуністаў і ветэранаў рабселькораўскага руху перадаюцца традыцыі і вопыт савецкага друку.

Часопіс дапамагае партыйным арганізацыям у кіраўніцтве рабселькорамі і нізавым друкам.

Кошт падпіскі на часопіс на год 1 руб. 20 кап., на 6 месяцаў— 60 кап., на 3 месяцы — 30 кап.

Выдавецтва «ПРАВДА».

Выпісвайце часопіс «ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ».

«Филологические науки» — часопіс серыі «Навуковыя даклады вышэйшай школы». У ім друкуюцца артыкулы па важнейшых праблемах літаратуразнаўства і мовазнаўства, па гісторыі літаратурных сувязей і пытаннях выкладання літаратуры ў вышэйшай школе.

Часопіс разлічаны на выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў філалагічных факультэтаў і факультэтаў замежных моваў ВНУ.

Часопіс выходзіць 4 разы ў год. Адзін нумар каштуе 1 рубель. Кошт падпіскі на год — 4 рублі, на паўгода — 2 рублі.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.
Друкарня Белсаўпрофа. АТ 04996. Тыр. 2000. Зак. 3556.